Будні сельскага клуба

Негарэльскім сельскім клубам загадвае Марыя Іванаўна Цімафеева. Гэтая невялікага росту жанчына, рухавая і энергічная, добра ведае культурна-асветную работу. У клубе ёсць выстаўкі, вітрыны, рэгулярна дэманструюцца кінафільмы, працуе бібліятэка. Тут можна пачытаць свежыя газеты і часопісы, адным словам — добра і культурна правесці свой адпачынак. Але не толькі гэта прыцягнула нас у сельскую ўстанову. Кожны, хто заходзіць сюды, не можа не звярнуць увагі на тое, што жыццё клуба ні на крок не адрываецца ад жыцця працоўных рэспублікі і краіны. Адбылася якая-небудзь падзея — яна адразу ж знаходзіць адбітак у наглядной агітацыі, лектарскай прапагандзе, кніжных вітрынах і выстаўках, літаратурных вечарах і сустрэчах. Так, напрыклад, аб поспехах працаўнікоў рэспублікі напярэдадні саракагоддзя БССР расказвае фотамантаж. Пра падзеі на Арабскім Усходзе і ў Францыі гаварылася ў лекцыях аб міжнародным становішчы. Выйшаў з друку раман «Крыніцы» І. Шамякіна — тут адбылася канферэнцыя чытачоў. Удзельнічаў у канферэнцыі і аўтар кнігі.

Але ёсць і такія пытанні, якімі работнікі клуба займаюцца штодзённа, выкарыстоўваючы разнастайныя формы і метады культасветработы. Да іх адносіцца пытанне аб мірным суіснаванні народаў свету, аб забароне атамнай зброі і спыненні яе выпрабаванняў.

— Жыхары Негарэлага адчулі жахі другой сусветнай вайны, — расказвае Цімафеева. —Усё наваколле было папалена бамбардзіроўкамі, артылерыйскім абстрэлам. Многа людзей загінула, многія сталі інвалідамі... Гэтыя будынкі, што вы бачыце, — школу, сельмаг, аптэку, кнігарню, жылыя дамы, — пабудавалі за апошнія гады. Вось чаму жыхары пасёлка: калгаснікі, служачыя, інтэлігенцыя горача падтрымліваюць прапанову Савецкага Камітэта аховы міру аб правядзенні месячніка за спыненне выпрабаванняў ядзернай зброі...

Але трэба заўважыць, што і раней сельскі клуб праводзіў вялікую работу сярод насельніцтва па прапагандзе савецкай міралюбнай палітыкі, па выкрыцці падпальшчыкаў новай вайны. Актыўную дапамогу клубным работнікам аказвалі сельскія актывісты — настаўнікі сярэдняй школы, урачы, вучні. З увагай праслухалі прысутныя лекцыі пра тое, якую пагрозу чалавецтву прыносяць выбухі атамнай бомбы, што праводзяць амерыканскія імперыялісты на астравах Ціхага акіяна. Лекцыю прачытаў настаўнік фізікі Негарэльскай школы Хведар Котаў. Расказаў ён і пра тое, як аберагчы сябе ў час атамнага выбуху. Запрасілі ў клуб лектара Дзяржынскага раённага камітэта партыі тав. Пячэрскага. Тэма яго гутаркі была — «Народы свету ў барацьбе за мір».

Пасля лекцыі значна павялічыўся попыт на літаратуру аб выкарыстанні атамнай энергіі ў мірных мэтах. Адных цікавіла будаўніцтва атамнага ледакола «Ленін», другія хацелі ведаць, як карыстаюцца атамам савецкія медыкі. Праўда, літаратуры па гэтых пытаннях у бібліятэцы яшчэ небагата, але сёе-тое можна знайсці ў часопісах, газетах, брашурах. Памяткай насельніцтву па ахове ад атамнай зброі зацікавілася настаўніца Надзея Лапіна, вучань сярэдняй школы Уладзімір Мірановіч, рабочы Уладзімір Сабалеўскі. Яны прыйшлі ў бібліятэку клуба, каб узяць неабходную літаратуру **(здымак у цэнтры).**

Другія цікавяцца наглядными матэрыяламі. Цімафеева разам з бібліятэкаркай Вольгай Валахановіч зрабілі фотамантаж. У ім — каштоўныя парады пра тое, як аберагчыся ў час атамнага выбуху, як павінны дзейнічаць санітарныя дружыны. Каля мантажу заўсёды ёсць людзі. Часта заходзіць у клуб пенсіянерка, актыўны чытач бібліятэкі 60-гадовая Марыя Іванаўна Бенідзіктовіч. Яе ўвагу прыцягнуў фотамантаж. Разглядаючы яго разам з жыхарамі пасёлка Раісай Жыбурт і Віктарам Меляшкевічам **(здымак уверсе),** яны дзеляцца думкамі.

— Выпрабаванні атамнай зброі, безумоўна, трэба спыніць, — гаворыць Марыя Іванаўна.—Калі б вучоныя ўсяго свету сілу атама накіравалі на мірныя мэты, які магутны зрух наглядаўся б у прамысловасці і сельскай гаспадарцы!

— А я чытаў артыкул пра тое, што ў хуткім часе цягнікі будуць рухацца атамамі. Савецкія вучоныя працуюць над гэтай праблемай. Было б цікава даведацца, — гаворыць Меляшкевіч.

— Так, — пагаджаецца Цімафеева. — Я прасіла Валодзю Русака. Ён штонебудзь прывязе...

Уладзімір Русак — кінамеханік клубнай стацыянарнай устаноўкі **(здымак унізе).** Разам з Цімафеевай Русак кожны месяц складае план паказу фільмаў. У плане ўлічваюцца пажаданні гледачоў на новыя карціны. Але план дэманстрацыі карцін цесна ўвязваецца з планам усёй работы клуба. Таму не выпадкова на сельскім экране паказвалася карціна «Першая ў свеце», якая расказвае пра работу савецкай атамнай электрастанцыі. У хуткім часе кінамеханік паказаў гледачам дакументальны фільм «Хірасіма». Усяго за апошні час наведвальнікі клуба прагледзелі каля дзесяці дакументальных фільмаў, прысвечаных барацьбе працоўных усяго свету за трывалы мір.

Негарэльскі клуб — актыўны прапагандыст імкненняў сельскіх працаўнікоў, якія, як і ўвесь наш народ, лічаць, што выпрабаванні атамнай зброі павінны быць спынены.

М. КРОТАЎ.
Фота Ул. Крука.

Дзяржынскі раён.

Гэта справа многіх

Прапагандзе сельскагаспадарчых ведаў і перадавога вопыту ў калектыўнай гаспадарцы надаецца цяпер вялікая ўвага. Многае могуць зрабіць кінаработнікі. Умела арганізаваны паказ сельскагаспадарчых фільмаў пры ўдзеле лектара прыносе вялікую карысць калгаснікам.

У рэспубліцы сёлета праводзіўся фестываль сельскагаспадарчых фільмаў. Кінасетка Міністэрства культуры паставіла ў калгасах, МТС і саўгасах каля адзінаццаці тысяч сеансаў з паказам гэтых фільмаў. На іх пабывала больш 830 тысяч чалавек. Апрача таго, на вёсцы прадэманстравана вялікая колькасць кароткаметражных навукова-папулярных фільмаў і часопісаў «Навіны сельскай гаспадаркі».

Як правіла, перад пачаткам гэтых сеансаў з лекцыямі, дакладамі, гутаркамі выступалі спецыялісты і перадавікі сельскай гаспадаркі — аграномы, ветэрынарныя работнікі, брыгадзіры, звеннявыя і калгаснікі.

Асабліва арганізавана прайшоў фестываль у Магілёўскай вобласці. Фільмы дэманстраваліся пераважна за сродкі калгасаў. Толькі ў Чэрыкаўскім раёне працавала пяць кіналекторыяў. Тут кожны месяц дэманстраваліся тры—чатыры сельскагаспадарчыя фільмы, якія суправаджаліся лекцыямі, дакладамі, гутаркамі.

У Асіповіцкім раёне праведзены месячны семінар калгасных брыгадзіраў. Кожная лекцыя суправаджалася паказам сельскагаспадарчых фільмаў. Большасць старшынь калгасаў дапамагалі механікам як мага лепш праводзіць сеансы.

У Бабруйскім раёне праўленне калгаса «Перамога» выдзеліла сродкі на паказ сельскагаспадарчых фільмаў і распрацавала графік іх дэманстрацыі ў кожнай брыгадзе і на жывёлагадоўчай ферме. Калгаснікі знаёмяцца аб гэтых кінасеансах праз мясцовы радыёвузел.

Нажаль, ёсць яшчэ кіраўнікі калгасаў, якія недаацэньваюць ролю кіно ў прапагандзе перадавога вопыту. Старшыні калгасаў «Шлях Леніна» Бабруйскага раёна тав. Стралкоў, імя Жданава Краснапольскага раёна тав. Сіпайла і некаторыя іншыя адмовіліся ад заключэння дагавораў на арганізацыю сеансаў з паказам сельскагаспадарчых фільмаў.

Добра быў праведзены фестываль у Гомельскай вобласці. Кінафільмы, як правіла, абмяркоўваліся гледачамі. Прапаганда і дэманстраванне сельскагаспадарчых фільмаў не скончыліся тут і пасля фестывалю.

Ініцыятарам шырокай прапаганды сельскагаспадарчых фільмаў у Рагачоўскім раёне выступіў кінамеханік С. Агранаў. Ён абавязаўся за месяц паставіць 20 сеансаў сельскагаспадарчых фільмаў. Сваё слова ён выконвае—ставіць па трыццаць фільмаў у месяц. Каштоўны пачын С. Агранава шырока падтрыманы ва ўсёй рэспубліцы.

Паспяхова прайшоў фестываль і ў Бярэзінскім раёне Мінскай вобласці.

Уздзенскі раённы аддзел культуры правёў у калгасе імя Кірава абмеркаванне фільмаў «Кукуруза — культура вялікіх магчымасцей» і «Асновы кармлення сельскагаспадарчай жывёлы». У абмеркаванні прынялі ўдзел старшыня калгаса тав. Прыпяцень, цялятніца Княткоўская, агранам Старасцін, свінарка Глебка і іншыя калгаснікі.

Брэсцкае абласное ўпраўленне культуры, каб палепшыць прапаганду сельскагаспадарчых фільмаў, увяло ва ўсіх раёнах спецыяльныя «агракінаперасоўкі».

Але і сёння ў некаторых абласцях рэспублікі прапаганда сельскагаспадарчых і навукова-папулярных фільмаў наладжана дрэнна. Варта перш за ўсё папракнуць Гродзенскае і Віцебскае абласныя ўпраўленні культуры.

Органы культуры павінны як след клапаціцца аб гэтай адказнай справе.

Д. ДРАНКЕВІЧ,
дыспетчар Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату Міністэрства культуры БССР.

Д У Л

Усесаюзная тэатральная канферэнцыя ў асноўным вырашала пытанні, якія непасрэдна датычацца драматычных тэатраў, іх узаемаадносін з драматургамі. Але на канферэнцыі ўзнік і рад іншых цікавых, хвалюючых пытанняў, у выніку шырокага і шчырага абмену думкамі. Гэта вельмі важныя праблемы выхавання кадраў—нашай змены, нашага заўтрашняга дня, моладзі, якой належыць прыняць эстафету з рук акцёраў і рэжысёраў старэйшага пакалення, развіваць і працягваць традыцыі мастацтва сацыялістычнага рэалізма.

Мастацтва не церпіць шэрасці, спакою. Часта мы, акцёры, рэжысёры, дырыжоры, вінаваты ў тым, што глядач сумуе ў тэатры. Не заўсёды мы бачым у нашых тэатрах высокія ўзоры акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства. Толькі сапраўднае веданне жыцця, вера ў простага савецкага чалавека, героя нашага сацыялістычнага жыцця, будаўніка камунізма, творчае хваляванне, страснасць, смеласць рэжысёрскай, дырыжорскай і акцёрскай думкі забяспечыць новы росквіт мастацтва.

Удасканаленне прафесіянальнага майстэрства, шматграннасць сродкаў як унутранай, так і знешняй сцэнічнай тэхнікі—майстэрства слова, рытму, руху — вырашэнне пытанняў арганізацыі ўсёй тэатральнай справы, больш рацыянальнае фарміраванне творчых калектываў—дапамогуць нашаму тэатру ў выкананні свайго абавязку перад народам.

Удзельнікі канферэнцыі з выключнай увагай слухалі выступленні вядучых рэ-

Натхняючыя

У атмасферы дружбы, высокага творчага ўздыму праходзіла Усесаюзная тэатральная канферэнцыя.

Пяць дзён у Маскве рэжысёры, артысты, драматургі і крытыкі горача абмяркоўвалі надзённыя пытанні сучаснага тэатральнага мастацтва. Менавіта аб гэтай сувязі мастацтва з жыццём народа гаворыць сардэчнае прывітанне ЦК КПСС канферэнцыі, у якім высока ацэньваюцца заслугі работнікаў савецкага тэатра на ніве сацыялістычнай культуры.

Нам прыемна, што ў цудоўную скарбніцу сацыялістычнага мастацтва беларускія тэатры ўнеслі і свой уклад. Праца нашых тэатраў была высока ацэнена на Дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве, на фестывалі тэатраў і музычных калектываў, прысвечаным 40-й гадавіне Кастрычніка.

Але каму многа даецца—з таго шмат і патрабуецца, — гаворыць мудрая народная прыказка.

Велічная праграма камуністычнага будаўніцтва, якую будзе абмяркоўваць XXI з'езд Камуністычнай партыі, узніме нашу краіну на новую ступень эканамічнага і культурнага росквіту. У высакароднай барацьбе народа за здзяйсненне велічных планаў пачэснае месца павінна заняць тэатральнае мастацтва.

Наш народ дастойны вялікага, крылатага мастацтва, новых спектакляў і вобразаў, прысвечаных роднай Камуністычнай партыі, высакароднай працы рабочага класа і сялянства, людзям самай перадавой у свеце навукі. А хіба ў нас многа п'ес і спектакляў аб гераічных справах нашай моладзі — заваёўніках цаліны і будаўніках новых шахт, заводаў? Менавіта аб гэтым галоўным напрамку савецкага тэатра гаворыць нам партыя.

У спрэчках і дыскусіях дэлегатаў, на пленарным пасяджэнні і секцыях выказана шмат практычных прапаноў аб удасканаленні рэжысёрскага і акцёрскага майстэрства, аб паляпшэнні мастацкага афармлення спектакляў, пра ўдасканаленне тэхнікі пастановачных частак тэатраў.

Лейтматывам усёй канферэнцыі было пытанне аб паглыбленні сувязі тэатральнага мастацтва з жыццём народа. У ажыццяўленні гэтай сувязі адно з пачэсных месц належыць савецкім драматургам. Ніякія рэжысёры і акцёры не могуць стварыць яркага высокамастацкага спектакля і вобраза ў слабой п'есе, якая напісана холадна, без яркіх фарбаў і глыбокіх жыццёвых канфліктаў.

Дэлегаты канферэнцыі выказалі заўвагі аб паляпшэнні творчай сувязі паміж тэатрамі братніх рэспублік. Выказаны прапановы аб рэарганізацыі вучобы нашых тэатральных інстытутаў, якія павінны лепш спалучаць вучэбны працэс з практыкай тэатра. Пачэснае месца заняло ў выступленнях дэлегатаў канферэнцыі пытанне аб выхаванні нашай творчай моладзі—акцёраў і рэжысёраў.

Вельмі цікавай была сустрэча дэлегатаў канферэнцыі з калектывам МХАТ'а, на якой народны артыст СССР М. Кедраў паведаміў аб творчых планах тэатра, аб працы над новым спектаклем «Трэцяя Пятэтычная», аб раскрыцці новых глыбінь спадчыны К. С. Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі.

Канферэнцыя адкрыла перад працаўнікамі тэатраў новыя шырокія далягляды ў галіне мастацтва сацыялістычнага рэалізма, у раскрыцці цудоўнага вобраза савецкага чалавека.

Шматгранна і ярка адлюстраваць гэты характар, заявілі дэлегаты ў пісьме Цэнтральнаму Камітэту партыі,—наш абавязак.

...Да перапынку засталося хвілін пяць, а Модзін ужо закончыў выкладанне вучэбнага матэрыялу па тэме «Калектывізацыя адноасобных сялянскіх гаспадарак». Хацелася крыху памаўчаць, падумаць. Неяк зусім нечакана ўспомнілася мінулае жыццё.

Дзесьці там, на Гомельшчыне, бацькі. Як яны цяпер там пажываюць? Пісьмы ён атрымліваў рэдка. Стары, можа, уступіў ужо ў калгас. А ён, Модзін, куды падасца пасля дэмабілізацыі з арміі?

Думаў камандзір, думалі моўчкі і байцы. Кожнага хвалявала гэтае пытанне.

Было гэта ў 1929 годзе.

НАРАДЖЭННЕ КАМУНЫ

Неспакойна было тады ў краіне. У некаторых гарадах яшчэ працягвалася беспрацоўе, ды і ў сельскай мясцовасці цяжка было ўладкавацца на работу.

— А што, калі б сапраўды паехаць працаваць у якую-небудзь камуну, скажам, тую самую Уваравіцкую, аб якой нам камандзір гаварыў на палітзанятках,—прапанаваў на перапынку Аркадзь Хархалёў. Яго падтрымалі іншыя. Неўзабаве байцы зайшлі ў курылку, дзе памкамузвода зацягваўся цыгаркай.

— Таварыш палітгрупавод! Я вырашыў ехаць пасля дэмабілізацыі на працу ў камуну. Вы знаёмы з уваравіцкімі камунарамі, памажыце мне туды папасці,—нясмела сказаў Хархалёў.

— І я паехаў бы...

— Куды ты паедзеш?—перапытаў яго таварыш.—Палітгрупавод можа нагаварыць што хочаш, а сам, глядзі, і не думае ехаць, а пра завод марыць. Неяк жа казаў, што да 1927 года жыў у горадзе.

— Жыў, ну і што,—адказаў Модзін.—Я вясковай справы не цураюся. Рабіў некалі на гаспадарцы.

Баец не супакойваўся.

— Калі вы згодны ехаць у камуну,—сказаў ён,—дык і я паеду.

— Значыць, будзем працаваць разам, — згадзіўся Модзін, крыху падумаўшы. Ён разумеў, якое значэнне мае ў такіх выпадках асабісты прыклад.

Тут жа, у курылцы, чатыры байцы разам з Модзіным вырашылі ехаць. Вечарам спіс павялічыўся ўдвая.

Вестка аб тым, што ваеннаслужачыя кавалерыйскага палка жадаюць стаць камунарамі, дайшла да палітаддзела Сёмай Са-

ЕННІЦКІМ З'ЕЗДАМ

Аналізаваць глыбока, усебакова

І. ДУБРОЎСКІ.

Некалькі гадоў назад я прачытаў верш Еўдакіі Лось. І ад душы радаваўся, што ў беларускую літаратуру прыйшла яшчэ адна таленавітая паэтэса.

І гэта сапраўды так.

Вось перада мной ляжыць невялікая па аб'ёму, але цікавая па зместу кніжка вершаў Еўдакіі Лось «Сакавік». Паэтэса з першых радкоў загаварыла сваім голасам. Яна і сама ўдала сказала аб гэтым у вершы «Адкрыццё». Шукаючы сярод паэтаў, «па чыім узоры мерку зняць», і захапляючыся творамі другіх, яна знаходзіць правільнае рашэнне:

Але думкі падыйшлі ціхутка, —
Я, прызнаўшы, што няма чужой,
Чысты аркуш падхапіла хутка
І рашыла быць сама сабой.

Самастойнасць паэтэсы вызначаецца амаль ва ўсіх вершах. Як удала, па-народнаму гаворыць яна аб харастве прыроды і людзей:

Цвеціна — на ўзлессі хаты,
Па кашу баравікі...
Нібы макаў цвет дзяўчаты,
А хлапцы — нібы дубкі.

Хараства на свеце многа,
Ну, а тут хоць адбаўляй!
Не здарма вялі дарогі
Усіх сватоў у гэты край.

Шчыра, свежа, па-новаму гаворыць Еўдакія Лось пра любоў, любоў у шырокім сэнсе, да ўсяго жывога, да ўсяго прыгожага. Праўда, іншы раз гэтыя пачуцці і думкі выказваюцца як асабістыя, прыватныя, не ўздымаюцца да шырокіх абагульненняў, і таму разам з любоўю не адчуваецца пачуцця нянавісці, якое ў наш век яшчэ можа быць такім жа святым, як і любоў. Ёсць і другія асобныя недахопы, але мы не збіраемся разглядаць усю кніжку, тым больш, што гэтыя недахопы мала прыкметныя ў тым багацці пачуццяў, думак, вобразаў, якое раскрыла нам паэтэса ў сваёй першай кніжцы. Зборнікам «Сакавік» Еўдакія Лось падала чысты, звонкі, бадзёры голас, паказала, што ёю знойдзена свая дарога ў паэзіі. Незразумела толькі адно: як пры такой упэўненай самастойнасці, што засведчана зборнікам, паэтэса, якая «крок за крокам ставіць з асалодай па гэтай любай, сонечнай зямлі», збілася са «святога грунту» на «стары дзірван?».

Гутарка ідзе пра верш, якім пачынаецца кніжка, «Мая любоў». У надрукаваным раней варыянце («Полымя» № 1 за 1957 год) было сказана пра родную зямлю словамі, напоўненымі глыбокага сэнсу:

Я хаджу па грунце святым,
Скарб пад ім дарагі ўтоен.

А ў зборніку ж перайначана:

Я па мяккай раллі хаджу,
Я хаджу па старым дзірване...

Гэтым радкам папярэднічаюць такія багатыя думкі і пачуцці, пададзеныя ў дасканалай паэтычнай форме:

Не чыноўнымі продкі былі —
З веку корпаліся на ніве.
А дарунак быў ад зямлі —
Мазалі на руках па сліве.
Бацька меў шчаслівейшы лёс,
Дый яго зямлёй прыхавала...
Многа выпала ў долы слёз,
Адгрымела падзей нямала.

Усе гэтыя слёзы і падзеі палеглі ў зямлю, «у капцох паснулі», таму і стаў грунт святым, таму ў ім і скарб дарагі ўтоен. Які вялікі сэнс закладзены ў гэтыя словы. І раптам чытаеш пра мяккую раллю, пра стары дзірван...

Далей. Сваю любоў да жыцця паэтэса перадала ў часопісным варыянце так:

Чую — лезе травінка на свет.
Чую — бухае плод у грудзі,
Чую — звон ад калосся плыве,
Чую — пчолка пралеску будзіць.

У кніжцы ж падана другая рэдакцыя найбольш моцнага з гэтых радкоў:

Чую — яблык бухае ў грудзі.

Словы «бухае плод у грудзі», сказаныя жанчынай, заключалі ў сабе глыбокі сэнс, глыбокае адчуванне жыцця. А «яблык бухае ў грудзі» — незразумела. Чаму яблык, якім чынам ён бухае ў грудзі?.. Тут нават паэтычнага вобраза няма.

Прачытаўшы зборнік вершаў, цяжка дапусціць, што паэтэса сама збілася з тропу, папсавала добры верш. Калі ж толькі гэта здарылася пад уплывам крытыкі або рэдактара, то хочацца параіць аўтару, прыгадаўшы словы вялікага паэта: ды не слухайце ж вы іх.

А калі гэта зрабіла яна сама, то рэдактар (А. Звонак) павінен быў перасцерагчы.

Ёсць і другія недахопы ў вершах Лось. Радок «Па кашу баравікі...» у вершы «Цвеціна» з такім трапным параўнаннем гучыць няўдала. Прыназоўнік «па» і назоўнік «кош» у фанетычным злучэнні ўспрымаюцца як дзеяслоў «пакасіць» у адзіночным ліку першай асобы будучага часу. (Вазьму касу і пакашу баравікі). Рэдактар павінен быў звярнуць увагу аўтара на гэту акалічнасць і зрабіць радок больш мілагучным, захаваўшы нарастанне.

Без крытыкі не можа развівацца літаратура, не змогуць расці маладыя сілы яе, але трэба імкнуцца глыбока, усебакова аналізаваць творчасць маладых. Гэтага нажаль, не стае ў артыкуле М. Хведаровіча («Літаратура і мастацтва» ад 4 кастрычніка 1958 г.), у якім ён сабраў гамузам творы васьмі паэтаў і злёгку прайшоўся па іх. Ён адзначыў, што ў кожнага з васьмі ёсць добрыя і слабыя вершы, што лёс кожнага з гэтых паэтаў залежыць ад таго, як яны будуць працаваць далей. Дык гэта смела можна сказаць і пра тых паэтаў, якія прыйдуць у літаратуру праз дзесяць, дваццаць гадоў, бо ў іх таксама вершы не будуць усе роўныя, іх лёс у літаратуры таксама будзе залежаць ад таго, як яны будуць працаваць.

Мімаходзь закрануў Хведаровіч і творы Лось, але адзначаных вышэй недахопаў не заўважыў або палічыў, што так і павінна быць. Размова гэтага аўтара звялася да таго, што «Лепшымі вершамі з'яўляюцца... (такія-та. — **І.Д.**) і іншыя» (якія? — **І. Д.**), «У некаторых вершах (у якіх? — **І. Д.**) заўважаецца проста неахайнасць (якая? — **І. Д.**) да паэтычнага слова». Вось і ўсё. «Маладой паэтэсе трэба быць больш патрабавальнай да сябе ў рабоце». А каму не трэба?

З кніжкі Еўдакіі Лось Хведаровіч прывёў чатыры радкі, як адну суцэльную страфу з верша «Клічуць дарогі».

Клічуць дарогі дальнія,
Клічуць дарогі блізкія...
Толькі на карту глянеш —
Вось яны, выбірай...

Не кажучы, што гэта не самы лепшы верш, трэба заўважыць, што такой страфы ў ім няма. Гэтыя радкі ўзяты крытыкам з розных частак верша і пададзены як адна суцэльная страфа, ад чаго страціўся сэнс. Мала таго, Хведаровіч змяніў рэдакцыю апошніх двух радкоў. У аўтара сказана:

Або на карту глянеш —
Вось яны — выбірай!

Тут, як бачыце, крытык не толькі адвольна змяніў словы, але нават знакі прыпынку паставіў не такія, як у аўтара.

Хведаровіча нельга папракнуць у нячулых адносінах да маладых. Артыкул яго напісаны з пачуццём спрыяльнасці да іх, у добразычлівым духу, але што можна сказаць у адным газетным артыкуле пра восем паэтаў адразу?!

Вартасці зборніка Еўдакіі Лось не змяншае маленькая часовая прыкрасць. Яе зборнік — добры першы поспех паэтэсы, прыемная і радасная з'ява ў нашай наогул добрай паэзіі.

Сустрэча з землякамі

Днямі Уздзенскі райком КПБ, раённы аддзел культуры і раённая бібліятэка правялі вялікі літаратурны вечар, прысвечаны саракагоддзю беларускай савецкай літаратуры.

Вечар адкрыў уступным словам загадчык аддзела прапаганды і агітацыі райкома партыі Ул. Нячаеў. Затым А. Якімовіч зрабіў даклад «Беларуская літаратура за 40 год».

З вялікай цікавасцю сустрэлі прысутныя выступленне К. Крапівы. Народны пісьменнік расказаў аб сваім жыцці і творчым шляху, прачытаў некалькі баек і вершаваных фельетонаў, адказаў на шматлікія пытанні чытачоў.

З чытаннем сваіх твораў на вечары таксама выступілі А. Якімовіч і А. Махнач.

Ад імя прысутных землякоў віталі і дзякавалі ім за прыезд загадчыца раённай бібліятэкі С. Краўцова, загадчык Прысынкаўскага сельскага клуба, заслужаны дзеяч культуры П. Шыдлоўскі і піянеры Уздзенскай сярэдняй школы.

Пісьменнікі пазнаёміліся з работай раённай бібліятэкі і падарылі ёй свае новыя кнігі.

На здымку: Народны пісьменнік **К. Крапіва** падпісвае сваю кнігу чытачцы Іры **Семянчук**.

Фота **Ул. Крука.**

Творы Платона Галавача

Нядаўна выйшаў у свет збор твораў П. Галавача.*) Хоць новае выданне ахоплівае не ўсё, што было напісана і ў свой час апублікавана пісьменнікам, тым не менш яно можа даць яснае ўяўленне аб творчасці П. Галавача.

Трохтомнік укладзены па жанраваму прынцыпу: у першы том увайшлі апавяданні, нарысы і артыкулы, у другі том — аповесці, у трэці — раман «Праз гады».

У межах кожнага тома вытрымліваецца хfreeраналагічная паслядоўнасць у размяшчэнні матэрыялу, і гэта, безумоўна, добра, паколькі дапамагае адчуванню росту пісьменніцкага майстэрства аўтара, дазваляе прасачыць яго шлях да мастацкай сталасці.

Ацэньваючы першы том як нешта цэласнае, адзначаем перш за ўсё момант ідэйнай насычанасці. Па тэмах апавяданні П. Галавача, у большасці надзённыя для свайго часу, адлюстроўваюць характэрныя для 20-х і 30-х гадоў жыццёвыя канфлікты, сітуацыі, ідэйныя і маральныя праблемы. За асобнай з'явай, прыватным бытавым фактам, учынкам ці перажываннем героя — за ўсім тым, што ляжыць у аснове апавяданняў, — можна бачыць або ўгадваць важныя працэсы новай рэчаіснасці, карэнныя змены жыцця, прынесеныя Вялікім Кастрычнікам. Вось, напрыклад, апавяданне «Рубанаўскі вузел». Тут увага сканцэнтравана на адной з галоўных сацыяльных праблем, што знайшлі сваё вырашэнне, дзякуючы сацыялістычнай рэвалюцыі, — на праблеме зямлі. Сяляне вёскі Рубанаўка не маглі дабіцца справядлівага землеўпарадкавання нават у вузкіх мэтах сваёй уласнасці — гэтаму перашкаджалі сам сацыяльны закон капіталістычнага ладу і яго непазбежныя спадарожнікі — гвалт, мана, подкуп. Толькі пасля рэвалюцыі рубанаўцы развязалі праклятый вузел і ўбачылі сілу чалавечай справядлівасці.

Раннія творы П. Галавача, напісаныя ў жанры апавядання, маюць пэўную цікавасць як гістарычна-пазнавальную, так і гісторыка-літаратурную. Калі пад першай мы разумеем, галоўным чынам, перадачу агульнага каларыту, самога подыху таго часу, то другая ўяўляецца нам як канкрэтнае праяўленне некаторых характэрных для 20-х і 30-х гадоў творчых тэндэнцый, як раннія пошукі шляхоў да сапраўды новага і сапраўды мастацкага слова.

Нельга не згадзіцца са сцвярджэннем Д. Бародзіча, аўтара ўступнага артыкула да збору твораў П. Галавача, што першыя творы пісьменніка маюць свае недахопы, што месцамі яны схематычныя, залішне расцягнутыя; месцамі аўтар нібы сам гаворыць за сваіх герояў, не здолеўшы знайсці для вырашэння іх пачуццяў і думак, толькі ім адным уласцівых. Развіваючы і не толькі ўдакладняючы гэтую думку, скажам, што П. Галавач у ранніх сваіх творах яшчэ не валодае па-сапраўднаму майстэрствам мастацкага апавядання, і гэта датычыцца не толькі мовы герояў або тэхнікі кампазіцыі ці такіх паасобных кампанентаў, як пейзаж у апавяданні. Дарэчы, Д. Бародзіч дае падставу да не зусім правільных вывадаў, калі ў парадку абагульнення залічае ў недахопы такую асаблівасць, як тое, што «малюнкі прыроды ў апавяданні носяць сімвалічны характар, адлюстроўваючы чалавечыя перажыванні».

Гутарка ідзе перш за ўсё аб тым, што не заўсёды выступае перад намі сталасць мастацкай ідэі, а адсюль розныя недахопы — і істотныя, і больш прыватныя. Да прыкладу, апавяданне «Загубленае жыццё» не знаходзіцца на вышыні шырокай тыпізацыі новых сацыяльных адносін пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, падмяняючы карэнную заканамернасць выпадковым трагічным фактам. Пры ўсім гэтым апавяданне вызначаецца павярхоўнасцю, беднасцю апісанняў, слабай псіхалагічнай матывіроўкай учынкаў герояў. Апошняе вельмі і вельмі зніжае эстэтычную каштоўнасць цікава задуманага апавядання «Дзве сцежкі». Толькі змест гэтага твора складае сутыкненне бацькі і сына, якія сталі рознымі, варожымі адзін аднаму паводле разумення жыцця і адносін да рэвалюцыі, увесь цэнтр цяжару і павінен быў легчы на развіццё маральна-псіхалагічнай лініі канфлікту. Гэтага, аднак, не дасягнуў аўтар у поўнай меры.

Мы лічым лепшымі з апавяданняў, што надрукаваны ў першым томе збору твораў, — «Кнак» і «Сваё ўласнае». Тут ужо ёсць каштоўныя элементы мастацкага твора — дакладнасць і выразнасць дэталі, жывая своеасаблівасць чалавечага характару, значнасць маральнай ідэі. І вось якраз у тым, як малады П. Галавач перадольваў недасканаласць сваіх першых літаратурных вопытаў, можна адчуваць нешта агульнае і важнае для пачатку шляху ўсёй нашай літаратуры.

Не раз узнімалася ў нашай крытыцы пытанне аб аднабаковасці і ўнутраных хібах так званай арнаментальнай прозы. Выразныя адзнакі гэтага стылю мы знаходзім у апавяданнях і М. Чарота, і маладога М. Лынькова, і П. Галавача. Характэрны прыклад з творчасці П. Галавача — апавяданне «Загубленае жыццё». Тут бярозы вабяць падарожных «шэлестам лісцяў сваіх»; «сенажаці прывольныя, кветкамі рознымі ўсыпаныя, травой, як шоўкам, усланыя» і г. д. Зусім зразумела, што не ў самой эмацыянальнасці, не ў самой рытміка-паэтычнай афарбаванасці фразы заключаюцца галоўныя недахопы арнаментальнай прозы. Выразная эмацыянальнасць, рамантычная ўзнёсласць, лірызм як стыляваная сфера прозы захоўваюць сваю сілу, сваю жыццяздольнасць і апраўданасць і ў сучаснай сталай мастацкай прозе ў якасці пэўных стылявых разнавіднасцей, плыней або струменяў. У чым жа тут справа? А справа ў тым, што ў ранні перыяд развіцця беларускай савецкай прозы «арнаменталізм» выступаў часта як пэўны двайнік павярхоўнага апісальніцтва, нават як своеасаблівы рамантызаваны бытавізм.

Мы бачым на творах П. Галавача, як усё больш сцвярджаецца паглыблены погляд на жыццё, падзею, чалавечы лёс. Ідэя не проста абрастае дэталямі, а вырастае па-новаму, выкрышталізоўваючыся з канкрэтных жыццёвыхназіранняў ужо як мастацкае абагульненне. З другога боку, перамагаецца і аморфнасць апісанняў факту ці падзей.

У апавяданні «Кнак», даволі стройным па сюжэту, прыпраўленым пэўнай дозай камізму і лёгкага гумару, самае каштоўнае — гэта іменна натуральнае развіццё ідэі з самога жыцця. Уласніцкая заскарузласць развенчваецца тут так, што пры гэтым не губляецца адчуванне жывых рыс чалавека.

Апавяданне «Сваё ўласнае» нясе ў сабе важнае зерне і філасофскага роздуму, яно закранае нешта з карэнных праблем чалавечай гісторыі. Страшэннае аблічча ўласніцтва тут абарочваецца жудасным трагізмам для яго ахвяр. У апавяданні ёсць апісанне бойкі паміж братамі за бацькоўскае дабро, — гэта, бадай, адно з самых моцных па сваёй суровай праўдзе месц. Недарма П. Галавач выкарыстоўвае падобны малюнак у аповесці «Спалох на загонах», дзе прыкоўвае ўвагу да калецтваў старога вясковага жыцця і сцвярджае новы шлях беларускага сялянства — шлях да сацыялізма.

Як і ўся маладая беларуская проза, П. Галавач ішоў да глыбіні аналізу, да псіхалагізму, да паўнацэннасці выяўленчых сродкаў, набываў належную культуру пісьменніцкай працы. Аб гэтым пэўным

*) Платон Галавач. Збор твораў у трох тамах. Рэдакцыйная калегія: Янка Брыль, Аркадзь Куляшоў, Іван Мележ, Алесь Якімовіч. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Мінск, 1958.